ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ «МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ»

АДДЗЕЛ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОТЫ
І ПАДРЫХТОЎКІ МЕДЫЯРЭСУРСАЎ

АДУКАЦЫЯ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў РЭСПУБЛІКАНСКІХ І АБЛАСНЫХ СМІ

Беларусь сегодня

Настаўніцкая газета

Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА

Рэспубліка

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

МІНСКАЯ ПРАЎДА

БИБЛИОГРАФИЧЕСКИЕ УКАЗАТЕЛИ «ОБРАЗОВАНИЕ МИНСКОЙ ОБЛАСТИ
В РЕСПУБЛИКАНСКИХ И ОБЛАСТНЫХ СМИ»
НА САЙТЕ МОИРО

«СБ. Беларусь сегодня» – общественно-политическая газета.

Основана в августе 1927 г. Выходит пять раз в неделю.

Учредители: Администрация Президента Республики Беларусь и Редакционный совет.

Адрес редакции: 220013, г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, 10а.

Web-сайт: http://www.sb.by

E-mail: pisma@sb.by

23.02.2021

Осипов, М. Воспитать патриота / М. Осипов // СБ. Беларусь сегодня. — 2021. — 23 февраля (№ 34). — С. 4-5.

От «символического» противостояния до образовательного успеха: как воспитать настоящих патриотов своего Отечества в условиях непрекращающихся информационных войн и навязывания сомнительных ценностей извне? И как объяснить, что за красивой внешне символикой порой скрывается кровавое прошлое? Порассуждать над этими вопросами в статье предложено компетентным экспертам — делегатам VI Всебелорусского народного собрания, среди которых директор средней школы № 17 города Борисова Андрей Волков.

Электронная версия статьи: *https://www.sb.by/articles/vospitat-patriota.html*

16.02.2021

Пастушенко, Т. Снежные снайперы / Т. Пастушенко // СБ. Беларусь сегодня. — 2021. — 16 февраля (№ 29). — С. 1, 8-9.

Финальный этап республиканских соревнований по биатлону «Снежный снайпер» на призы Президентского спортивного клуба, собрал в главном биатлонном центре страны почти 200 мальчишек и девчонок из всех регионов, стал настоящим праздником для юных спортсменов-любителей.

В этом году победителями в общекомандном зачете стали спортсмены из Минска, замкнули тройку лидеров команды Могилевской и Минской областей.

Электронная версия статьи: *https://www.sb.by/articles/finalnyy-etap-snezhnogo-snaypera-zavershilsya-v-raubichakh.html*

«Настаўніцкая газета» – выданне асветнікаў Рэспублікі Беларусь.

Выдаецца з 20 снежня 1945 года. Выходзіць тры разы на тыдзень.

Заснавальнік: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77.

Web-сайт: http://nastgaz.by/

27.02.2021

Рэва, Д. У цэнтры ўвагі — развіццё асобаснага патэнцыялу падрастаючага пакалення / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2021. — 27 лютага (№ 23). — С. 4.

Падвесці вынікі і рухацца наперад — такая задача штогод паўстае перад удзельнікамі выніковай калегіі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама. Сёлета яе ўдзельнікі працавалі вочна, сабраўшыся ў Мінскім абласным выканаўчым камітэце, а таксама дыстанцыйна — у кожным раёне вобласці была арганізавана работа студый, адкуль да галоўнай рабочай пляцоўкі падключаліся па відэасувязі.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/u-tsentry-uvagi-razvitstsyo-asobasnaga-patentsyyalu-padrastayuchaga-pakalennya/*

25.02.2021

Хрышчановіч, Н. Мы – першыя! / Н. Хрышчановіч // Настаўніцкая газета. — 2021. — 25 лютага (№ 22). — С. 1.

Завяршылася дэбютная змена Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка "Мы — першыя!".

30 школьнікаў з усёй краіны вучыліся па напрамках "Зялёная хімія", "Інфармацыйныя тэхналогіі" і "Робататэхніка". 22 лютага яны сустрэліся з міністрам адукацыі, каб падзяліцца ўражаннямі, расказаць пра свае праекты і выказаць прапановы.

Так, Расціслаў Шчуроўскі, навучэнец 10 класа гімназіі № 2 Салігорска, прэзентаваў сайт праекта Evosol ("Модульнасць у вымяральных прыборах"). Ён стварыў інфармацыйны вэб-рэсурс, які дазволіць эфектыўна ўзаемадзейнічаць з карыстальнікамі для продажу прадукцыі спецыялізаванага праграмнага забеспячэння, а таксама рэкламы самога праекта.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/my-pershyya-2/*

Хідджаз, М. Дом гарманічных адносін / М. Хідджаз // Настаўніцкая газета. — 2021. — 25 лютага (№ 22). — С. 11. (Дадатак "Сацыяльны ракурс")

Сацыяльна-педагагічная работа прадугледжвае шмат форм і метадаў яе ажыццяўлення. Напрыклад. Клубная работа аб'ядноўвае людзей з аднолькавымі інтарэсамі на прынцыпах самадзейнасці і самакіравання. Стрыжнем такога аб'яднання можа стаць школа, яе сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная служба.

Так адбываецца і ў Заямнаўскай сярэдняй школе Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці, дзе з 2017 года паспяхова працуе дзіцяча-бацькоўскі клуб.

ЛЮТЫ

Сахно, Н. З эфектам метафары / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. — 2021. — 25 лютага (№ 22). — С. 9, 12. (Дадатак “Сацыяльны ракурс”)

Абараняць правы дзяцей, дапамагаць рэалізоўваць свае магчымасці і ідэі, правільна сацыялізавацца, не баяцца выказваць меркаванні і своечасова паклікаць на дапамогу – усё гэта толькі невялікі спіс тых абавязкаў, што ўскладзены на сацыяльных педагогаў школы. Пра тое, наколькі рэальна ўсё гэта паспець у артыкуле расказвае Кацярына Патула, сацыяльны педагог сярэдняй школы № 18 Барысава. Дарэчы, менавіта Кацярына Патула стала пераможцай конкурсу “Педагог сакцыяльны - 2020”, які мінулым летам праводзіўся ў Мінскай вобласці.

Сахно, Н. Ад драмы да камедыі, ці Як крэатыў мяняе дзяцей / Н. Сахно // Настаўніцкая газета. — 2021. — 25 лютага (№ 22). — С. 9, 12. (Дадатак “Сацыяльны ракурс”)

Пра псіхолага-педагагічнае суправаджэнне ў гімназіі Мар’інай горкі, якія метады дапамагаюць адкрыць дзіцяці новыя магчымасці і якое месца ў рабоце школьнага псіхолага павінна займаць творчасць, у артыкуле расказвае педагог-псіхолаг Мар’інагорскай гімназіі Аксана Канстанцінаўна Баронава.

Рэва, Д. Кіраўнік павінен быць камандным гульцом / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2021. — 25 лютага (№ 22). — С. 19.

У артыкуле Дзяніс Валер’евіч Зубенка, дырэктар Мар’інагорскага дзяржаўнага ордэна “Знак Пашаны” аграрна-тэхнічнага каледжа імя У. Е. Лабанка, расказвае пра тое, як яго каманда развівае ўстанову, пра каледж, які ён шчыра любіць.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/kiraunik-pavinen-byts-kamandnym-gultsom/*

23.02.2021

Марозава, Т. “Спартанцы” выхоўваюць характар / Т. Марозава // Настаўніцкая газета. — 2021. — 23 лютага (№ 21). — С. 1.

У артыкуле Таццяна Марозава, педагог дадатковай адукацыі Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна, расказвае пра Аляксандра Мікалаевіча Міхнюка, кіраўніка цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі, які ўжо чатыры гады працуе ў сярэдняй школе № 2 Салігорска.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/spartantsy-vyhouvayuts-haraktar/*

Жахоўскі, А. Бачыць хімію вакол сябе, а не толькі ў падручніку / А. Жахоўскі // Настаўніцкая газета. — 2020. — 23 лютага (№ 21). — С. 12. (Дадатак “Партфоліа”).

У артыкуле Аляксей Жахоўскі, настаўнік біялогіі і хіміі сярэдняй школы № 23 Барысава, расказвае аб выкладанні хіміі, аб практычнай накіраванасці навучання, што спрыяе развіццю пазнавальнага інтарэсу.

20.02.2021

Дубоўская, В. Выпадковых людзей сярод настаўніцтва быць не павінна / В. Дубоўская // Настаўніцкая газета. — 2021. — 20 лютага (№ 20). — С. 1,2.

17 лютага на базе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта прайшла калегія Міністэрства адукацыі. Дзе падвялі вынікі работы галіны за 2020 год і абмеркавалі алгарытм узаемадзеяння ўсіх зацікаўленых па ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Па выніках работы ганаровая грамата Міністэрства адукацыі ўручана Т.А.Канавалёнак, намесніку дырэктара па вучэбнай рабоце сярэрняй школы № 3 г. Крупкі, ганаровую грамату Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымала дырэктар Ждановіцкай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната І.В.Волчак.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/vypadkovyh-lyudzej-syarod-nastaunitstva-byts-ne-pavinna/*

Саланец, І. Крыніца творчасці крываносаўскіх паэтаў / І. Саланец // Настаўніцкая газета. — 2020. — 20 лютага (№ 20). — С. 11. (Дадатак “Шосты дзень”)

У артыкуле Ірына Саланец, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Крываносаўскай сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза Р.Н.Мачульскага Старадарожскага раёна, расказвае пра аб’яднанне па інтарэсах “Крыніцы”, якое дзейнічае ў установе адукацыі.

Электронная версія артыкула: *https://6day.ng-press.by/maladzyozhnaya-hvalya/krynitsa-tvorchastsi-kryvanosauskih-paetau/*

Аб узнагароджанні // Настаўніцкая газета. — 2020. — 20 лютага (№ 20). — С. 15.

Па выніках работы сістэмы адукацыі за 2020 год загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і пераходзячым сімвалам якасці “Лепшы ў адукацыі” ўзнагароджаны ў намінацыі “За лепшую работу па забеспячэнні якасці падрыхтоўкі кадраў з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй у адпаведнасці з запатрабаваннямі арганізацый” калектыў дзяржаўнай установы адукацыі “Клецкі сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй”.

18.02.2021

Хрышчановіч, Н. Праз робататэхніку – да будучыні / Н. Хрышчановіч // Настаўніцкая газета. — 2021. — 18 лютага (№ 19). — С. 3.

У Бараўлянскай сярэдняй школе № 3 Мінскага раёна прайшоў юбілейны, пяты, абласны конкурс па робататэхніцы "Дарога ў будучыню". Ужо другі год запар ён часткова з'яўляецца этапам Кубка па адукацыйнай робататэхніцы, а значыць, вынікі ідуць у агульны залік КАР.

Конкурс аб'яднаў 175 каманд з усёй Беларусі, якія спаборнічалі па 12 напрамках. Больш за ўсё перамог атрымалі навучэнцы сярэдняй школы № 3 Нясвіжа, сярэдняй школы № 4 Дзяржынска, гімназіі Лагойска, сярэдняй школы № 24 Барысава, гімназіі-інтэрната Мядзела, выхаванцы Клуба тэхнічнай творчасці PinMode і STEM-класа RoboClever.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/praz-robatatehniku-da-buduchyni/*

Клюйко, А. У плыні ўстойлівага развіцця і сфарміраванай перспектывы / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. — 2021. — 18 лютага (№ 19). — С. 4.

Інтэрв'ю з начальнікам галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Мікалаем Мікалаевічам Башко, які расказвае пра сябе, пра сістэму адукацыі Міншчыны і перспектывы яе развіцця.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/u-plyni-ustojlivaga-razvitstsya-i-sfarmiravanaj-perspektyvy/*

16.02.2021

Хідджаз, М. "Дзеці ў нас добрыя" / М. Хідджаз // Настаўніцкая газета. — 2021. — 16 лютага (№ 18). — С. 13.

Артыкул прысвечаны Таццяне Міхайлаўне Андрэю Іванавічу Барытоль, бацькам-выхавацелям з дзіцячага дому сямейнага тыпу, што ў аграгарадку Вялічкавічы Салігорскага раёна. Нядаўна Таццяна Міхайлаўна і Андрэй Іванавіч Барытоль сталі лаўрэатамі прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" за значны ўклад у выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Электронная версія артыкула: *https://nastgaz.by/dzetsi-u-nas-dobryya/*

13.02.2021

Скачак, А. Яе рук справа / А. Скачак, А. Алісіевіч // Настаўніцкая газета. — 2020. — 13 лютага (№ 17). — С. 5. (Дадатак "Адукацыйная прастора")

У артыкуле Алена Скачак, Аксана Алісіевіч, настаўніцы гімназіі № 1 Барысава, расказваюць пра сваю калегу, настаўніцу навучальнай установы Галіну Фёдараўну Савіцкую.

ЛЮТЫ

Варвашэвіч, Л. Пазлы як сродак павышэння матывацыі малодшых школьнікаў / Л. Варвашэвіч // Настаўніцкая газета. — 2020. — 13 лютага (№ 17). — С. 11.

У артыкуле Людміла Варвашэвіч, настаўніца пачатковых класаў Соснаўскай сярэдняй школы Любанскага раёна, расказвае пра тое, як павысіць вучэбную матывацыю малодшых школьнікаў, каб іх навучанне было паспяховым не толькі на I ступені навучання, але і ў далейшай вучобе.

09.02.2021

Шымко, Т. Глядзець наперад і не спыняцца на дасягнутым / Т. Шымко // Настаўніцкая газета. — 2021. — 09 лютага (№ 15). — С. 3.

Дэлегатам VI Усебеларускага народнага сходу была абрана настаўніца беларускай мовы і літаратуры Атраднаўскай сярэдняй школы Любанскага раёна Мінскай вобласці Ірына Аляксандраўна Ленская. У сваім рэгіёне і не толькі яе ведаюць як прафесіянала сваёй справы, дэпутата Рачэнскага сельвыканкама, клапатлівую маці і неабыякавага чалавека, які шчыра любіць свой родны край.

Электронная версія артыкула:
https://nastgaz.by/glyadzets-naperad-i-ne-spynyatstsa-na-dasyagnutym/

Калядзіч, Н. “Шчасце настаўніка — калі ў вучняў застаюцца самыя цудоўныя ўспаміны пра школу” / Н. Калядзіч // Настаўніцкая газета. — 2021. — 09 лютага (№ 15). — С. 6.

На пачатку года сталі вядомы вынікі I Міжнароднага конкурсу педагагічнага майстэрства “Настаўніцкая анлайн-лабараторыя Рыбакоў Фонду”, у якім прынялі ўдзел каля 2,3 тысячы настаўнікаў, студэнтаў педагагічных УВА з Расіі, Беларусі, Украіны і Казахстана. У намінацыі “Лепшы ўрок па праграме Беларусь” перамогу атрымала настаўніца рускай мовы і літаратуры намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Ленінскага ясляў-сада — сярэдняй школы Слуцкага раёна Мінскай вобласці Ірына Яцук. Пра тое, што прывяло педагога да поспеху, як зрабіць урокі рускай мовы і літаратуры цікавымі і змястоўнымі, расказваецца ў артыкуле.

Электронная версія артыкула:
https://nastgaz.by/shchastse-nastaunika-kali-u-vuchnyau-zastayutstsa-samyya-tsudounyya-uspaminy-pra-shkolu/

Шымко, Т. EnglishOK: вучыцца камфортна і з задавальненнем / Т. Шымко // Настаўніцкая газета. — 2021. — 09 лютага (№ 15). — С. 7.

Настаўніца англійскай мовы Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна Мінскай вобласці настаўнік-метадыст Аксана Уладзіміраўна Якіменка ўжо на працягу некалькіх гадоў працуе над стварэннем уласных адукацыйных рэсурсаў. У выніку ў яе з’явіўся настаўніцкі блог EnglishOK з інтэрактыўным кантэнтам. Ён стаў выдатным віртуальным памочнікам, які дапамагае вучням самастойна справіцца з дамашнім заданнем і прыйсці на ўрок падрыхтаванымі і ўпэўненымі.

Электронная версія артыкула:
https://nastgaz.by/englishok-vuchytstsa-kamfortna-i-z-zadavalnennem/

ЛЮТЫ

Рэва, Д. Дасягнуць максімуму ў прафесіі і творчасці / Д. Рэва // Настаўніцкая газета. — 2021. — 09 лютага (№ 15). — С. 13.

Завяршыўся Рэспубліканскі інфармацыйна-прафарыентацыйны праект "Праф-БУМ — 2020". Штогод удзельнікамі рэспубліканскага праекта становяцца навучэнцы ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Так, каманда Барысаўскага дзяржаўнага каледжа бярэ ўдзел у праекце з самага першага рэспубліканскага "ПРАФ-БУМа" і кожны раз становіцца прызёрам. Вось і гэтым разам барысаўчане адзначаны ўзнагародай за ўкараненне масавых інфармацыйна-камунікацыйных форм, выяўленне і падтрымку маладзёжных творчых ініцыятыў.

Электронная версія артыкула:
https://nastgaz.by/dasyagnuts-maksimumu-u-prafesii-i-tvorchastsi/

04.02.2021

Анікевіч, І. Станты, піраміды, акрабатычныя элементы / І. Анікевіч // Настаўніцкая газета. — 2021. — 04 лютага (№ 13). — С. 4.

31 студзеня ў Палацы спорту Мінска прайшлі спаборніцтвы і кубак Беларусі па чырлідынгу. У іх удзельнічалі 13 клубаў з Гродзенскай, Гомельскай і Мінскай абласцей.

Электроная версія артыкула: *https://nastgaz.by/stanty-piramidy-akrabatychnyya-elementy/*

Алісіевіч, А. Да саманавучальнай арганізацыі шляхамі "хансэй" і "кайзен" / А. Алісіевіч // Настаўніцкая газета. — 2021. — 04 лютага (№ 13). — С. 7.

Артыкул намесніка дырэктара гімназіі № 1 г. Барысава пра выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій і развіццё дыстанцыйнага навучання.

Кацельнікаў, А. Глядзець у адным напрамку / А. Кацельнкаў // Настаўніцкая газета. — 2021. — 04 лютага (№ 13). — С. 13.

Артыкул пра спартыўную дзейнасць сям'і Відзякіных з Маладзечна. Мікалай Яўгенавіч Відзякін – настаўнік фізічнай культуры Гарадоцкай базавай школы і Алена Аляксандраўна – майстар спорту па зімовым мнагаборстве.

02.02.2021

Клюйко, А. Міні-вытворчасць для інавацый / А. Клюйко // Настаўніцкая газета. — 2021. — 02 лютага (№ 12). — С. 4.

Артыкул пра рэсурсны цэнтр Слуцкага дзяржаўнага каледжа.

«Мінская праўда» – абласная грамадска-палітычная газета.

Заснавана 1 лістапада 1950 года. Выходзіць тры разы на тыдзень.

Заснавальнікі: Мінскі абласны выканаўчы камітэт, Мінскі абласны Савет дэпутатаў, калектыў Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Рэдакцыя газеты «Мінская праўда».

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Web-сайт: http://www.mpravda.by

E-mail: info@minpraud.by

09.02.2021

Слижевская, И. Инициативы юных парламентариев / И. Слижевская // Мінская праўда. — 2021. — 09 лютага (№ 10). — С. 14.

В конце января состоялась вторая сессия Молодежного парламента г. Молодечно. На сессии присутствовала председатель Молодечненского районного совета ветеранов Татьяна Шафалович. На вручила членам Молодежнгого парламента Благодарность за сохраненике преемственности поколений.